Міжбібліятэчны творчы конкурс на лепшае масавае мерапрыемства да 140-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа “Подых паэзіі Вялікіх Песняроў” быў арганізаваны сярод бібліятэк ДУК “Пінская ГЦБС” з 1 чэрвеня па 31 лістапада 2022г.

У аглядзе-конкурсе прынялі ўдзел бібліятэкі-філіялы №1, №3, №5, №7, гарадская дзіцячая бібліятэка ім.Я.Коласа, абанемент і чытальная зала гарадской цэнтральнай бібліятэкі.

Адной з першых увазе журы была прадстаўлена *літаратурная імпрэза “З Купалам у сэрцы”*, падрыхтаваная чытальнай залай гарадской цэнтральнай бібліятэкі. На працягу ўсяго мерапрыемства гучалі вядомыя вершы Янкі Купалы. Адметна, што на літаратурным свяце прысутнічаў мясцовы паэт, кампазітар, Віктар Мяцельскі, які выканаў песні на вершы Янкі Купалы.

У бібліятэцы-філіяле №5 была арганізавана *літаратурная гадзіна “Вобразы мілыя роднага краю”*. Адметнай часткай мерапрыемства стаў актыўны ўдзел вучняў 4 класа ў літаратурным падарожжы. У іх выкананні прагучалі вершы Якуба Коласа аб роднай прыродзе і была прадэманстравана інсцэніроўка казкі “Зайчыкі”. Напрыканцы сустрэчы былі падведзены вынікі конкурсу на лепшы малюнак па творам пісьменніка “Вобразы мілыя роднага краю”.

У гарадской дзіцячай бібліятэцы ім. Я. Коласа адбылася *літаратурная гульня “Якуб Колас для маленькіх”*. Цікавым і захапляльным момантам сталі рухомыя гульні, паказ тэатралізаванай казкі “Зайкіна хатка” ў апрацоўцы Я. Коласа і невялікай інсцэніроўкі з паэмы “Новая зямля”.

У бібліятэцы-філіале №1 прайшло *літаратурнае падарожжа “І ўся зямля была ім спадчынай”*. Бібліятэкары сцісла азнаёмілі школьнікаў з жыццёвым і творчым шляхам народных пісьменнікаў. Вучні, пераапранутыя ў нацыянальныя касцюмы, прачыталі вершы класікаў. Акрамя кніжнай выставы, цікава быў аформлены куток з фотаздымкамі, размешчанымі на саматканых рушніках, што прыцягвала ўвагу прысутных. Адметным было тое, што быў падрыхтаваны стол з сялянскімі стравамі і бібліятэкары пастараліся паўтарыць сцэну абеда ў лесніковай пасадзе з паэмы Я. Коласа “Новая зямля”.

Бібліятэка-філіял №7 запрасіла прысутных ў *літаратурнае падарожжа “Пінскімі шляхамі Якуба Коласа”*. Удзельнікам сустрэчы нагадалі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, асабліва пра гады, звязаныя з Пінскам і Піншчынай. Цікавым момантам мерапрыемства стала тэатралізаваная імпрэза “Першы дзень Якуба Коласа ў Пінску”, а таксама гучанне вершаў у выкананні ўдзельнікаў народнага тэатра моладзі “Визави”.

Бібліятэка-філіал №3 запрасіла ўдзельнікаў клуба «Данко» на *літаратурнае свята “Пясняр Радзімы сінявокай”*, прысвечанае Янку Купале. Падчас імпрэзы гучалі аўдыа-матэрыялы з купалаўскімі вершамі і песнямі, прадэманстраваны відэа-матэрыялы.

Абанемент гарадской цэнтральнай бібліятэкі падрыхтаваў *вечар-прысвячэнне “Купала і Колас, вы нас гадавалі”*. Аб перыядзе жыцця Якуба Коласа, звязанага з Пінскам, юнакам паведаміла краязнаўца і экскурсавод

Ірына Дзмітрыеўна Чараўко. Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава, аздобленая аўтэнтычнымі рэчамі з народнага побыту. Адметнай часткай мерапрыемства стала тое, як дэкламаваліся вершы класікаў у выкананні супрацоўніка, пераапранутага ў нацыянальную вопратку.

Падводзячы вынікі, хочацца адзначыць, што ўсе мерапрыемствы былі цікавымі і пазнавальнымі для дзяцей, насычанымі рознымі формамі і метадамі бібліятэчнай дзейнасці.

Такім чынам, пераможцамі конкурсу сталі:

1 месца - супрацоўнікі абанемента гарадской цэнтральнай бібліятэкі;

2 месца – бібліятэка-філіял № 3 і супрацоўнікі чытальнай залы гарадской цэнтральнай бібліятэкі;

3 месца – бібліятэка-філіял № 1.

Віншуем пераможцаў!